РАДЗІМЕ ЖЫЦЦЁ ПРЫСВЯЧАЮ!



29 жніўня 2019 года адзначае свой юбілей беларускі пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі **Мікалай Уладзіміравіч ДАВІДОВІЧ.**

Мікалай Давідовіч – відная фігура ў пісьменніцкім асяроддзі Магілёўшчыны: са сваім адметным стылем, выразнай, толькі яму ўласцівай мовай. З-пад яго пяра выйшла больш за дзясятак кніг публіцыстыкі, мастацкай прозы. Сярод іх – "Квецень маёй вясны", "Я выбіраю Бабруйск", "Слухаю і раздумваю", "Вугал зроку" і інш. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца непрыгодніцкая, як пазначае аўтар, аповесць "Дзе мы? – На тым свеце...", у якой расказваецца аб незвычайнай гісторыі знаёмства маладых людзей, іх каханні, далейшым жыццёвым лёсе – гэткі сучасны бэстсэлер. Некалькі апавяданняў М.Давідовіча, у тым ліку "Пробны выезд", перакладзены на ўкраінскую мову і змешчаны ў мясцовым друку гэтай дзяржавы. Кніга публіцыстыкі "Клічу ў будучыню", у якой нарысы пра клас бізнесменаў і прадпрымальнікаў, што зараджаецца, – лаўрэат прэміі беларускага Саюза прадпрымальнікаў. Не менш цікавай, па прызнанні крытыкі, з'яўляецца адна з апошніх кніг "Падрэзанае крыло", главы з якой надрукаваны ў галоўным часопісе беларускіх літаратараў "Полымя" за 2017 год.

Нарадзіўся Мікалай Уладзіміравіч 26 жніўня 1949 года ў вёсцы Малыя Бортнікі Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры, факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Служыў у Савецкай Арміі. Працаваў настаўнікам у школе, інструктарам па спорце ў спартыўным таварыстве «Дынама». З 1973 года – на журналісцкай ніве: займаў пасады карэспандэнта, намесніка рэдактара, галоўнага рэдактара бабруйскай раённай газеты «Трыбуна працы». Больш за дзесяць гадоў быў уласным карэспандэнтам газеты «Рэспубліка» па г.Бабруйску.

Мікалай Давідовіч – актыўны папулярызатар беларускай літаратуры, роднага слова. Ён часта выступае ў працоўных калектывах, школах, бібліятэках, аздараўленчых і іншых установах.

Ён падстаўляе плячо, ці, дакладней, пяро, там, дзе яно патрэбна. Так, ён адрэдагаваў знойдзены дзённік камандзіра разведгрупы "Сямёрка" Мікалая Варожышчава, якая дзейнічала ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Быхаўскага раёна, а затым выдаў іх асобнай кніжкай пад назвай "Па радыёграме – у Быхаўскі раён", тое ж зрабіў і з нататкамі жыхара мястэчка Баркалабава таго ж раёна Віктара Куляшова, давёўшы іх да ладу і выпусціўшы кнігу "Таямніцы і паданні Баркалабаўскага краю".

Такія творцы, як Мікалай Давідовіч, умацоўваюць аўтарытэт пісьменніцкага Саюза не толькі сваімі творамі, але і дзеяннямі, учынкамі, заслугоўваюць павагі і прызнання.

Мікалай Уладзіміравіч лаўрэат прэмій Саюза прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь, беларускага Саюза журналістаў «Залатое пяро», Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь імя Івана Чыгрынава, адзначаны нагрудным знакам беларускага Саюза пісьменнікаў «За вялікі ўклад у літаратуру».

ВІНШУЕМ

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ:

4 жніўня
Казеку Аляксандра Мікалаевіча

22 жніўня
Азаранку Наталлю Пятроўну

26 жніўня
Давідовіча Мікалая Уладзіміравіча

ПАЭЗІЯ І ПРОЗА ЗЯЛЁНАГА БОРУ

Ідзяце да зялёнага сябра, каб спаважыць яго ці зняважыць?

Мясцовасць, адкуль я родам, бязлесная. Палі – на многія кіламетры, аж да самага небасхілу. Якія прасторы, ні з чым непараўнальныя пахі! Колькі хараства, прыгажосці! Мы, дзятва, любілі бываць на палетках. Прыходзілі сюды не толькі назіраць, любавацца, але і даглядалі расліны, убіралі ўраджай. Словам, рабілі ўсё тое, што і дарослыя. Бывала, дамоў прыйдзеш і ног пад сабой не адчуваеш. А назаўтра – дзе тая стома падзелася – зноў бяжыш...

І ўжо, выпырхнуўшы з гнёздаў, зведаўшы іншае, заманлівае жыццё, мы ўсё роўна вярталіся да сваіх палеткаў. Здавалася, нішто з імі не магло параўнацца, а тым больш – замяніць.

Але...

Не прыпомню дакладна, дзе і калі ўпершыню я пабачыў лес... Ён уразіў незвычайна – сваёй велічнасцю, як здалося, непрыступнасцю, унутранай гармоніяй. Лес вабіў, прыцягваў да сябе. Але колькі ні прыходзіў, не мог да канца задаволіць сваю цікаўнасць. І сапраўды, хто гэта пакінуў знак на кары дрэва? Чыя песня даносіцца з гушчару? Куды вядзе гэта амаль непрыкметная сцяжынка?

І трэба ж, кватэру ў шматпавярховым доме мы атрымалі ля самага лесу. Узнімаешся раніцай ды бачыш ледзь прыкметную, шэраватую паласу... А праходзіць колькі хвілін, і ўжо можам разгледзець рады стройных хваін. Выходзіш на прыпынак, а дрэўцы махаюць «рукамі»-лапкамі, бы вітаюць цябе. Міжволі залюбуешся...

Але найбольшая радасць і задавальненне – ад працяглых сустрэч з лесам. Вядома, зімой, калі разгульваюць шызыя мяцеліцы, поўна снегу, доўга там не прабудзеш. Затое вясной! Яшчэ падмарожвае, але сонца робіць сваю справу. Па дарозе цябе абганяюць ручаінкі з-пад наледзяў. Заназдрыўся снег, чырванеюць над ім сваім голлем вербалозы, трымцяць завушніцы на трапяткіх бярозах, ужо і пралескі прабіваюцца на праталінах, маладая траўка шчыцце ўзнімае.

Не заўважыш, як наплыве вечар. Паветра робіцца густым і вязкім, гукі – звонкімі і чыстымі. Пачуццё чагосьці нязведанага, роднага і блізкага ахоплівае цябе. Хочацца гукаць, кудысьці ісці...

Лета. Чарніцы пайшлі. Віселі зеленаватыя, драбнюткія, а тут ураз пабуравелі, наліліся жывільным сокам. Не зявай – убірай ураджай! Памятаю, жонка і сын гатовы хоць зараз ісці ў лес. І малое дзіця бяром з сабой. Ягады – у руку, сядзіць, занялася. А мы за работу: увойдзем у зімку з прыпасамі!

Грыбная пара... Вечароў, што прыхопліваем пасля работы, вядома ж, малавата. З нецярпеннем чакаем выхадных. І вось яны прыйшлі. Рыхтуемся грунтоўна, усебакова. У кожнага свае абавязкі. Мы з сынам ладзім кашы, падбіраем «рабочы інструмент», жонка, памятаючы, што на паветры апетыт разгульзаецца, збірае «падмацаванне». Дачка – яна ўжо актыўная ўдзельніца паходаў – гатова да выхаду.

І вось мы ў дарозе. Хто ідзе, а хто едзе... на бацькавай спіне. Абы ціха! Вось і знаёмая сцяжынка. Раней тут браў грыбы, а ці пашанцуе на тэты раз? Зрэзаў некалькі сыраежак, пару маслякоў. І усё?! Нечакана падае, зачапіўшыся за галінку, мой капялюш. Згінаюся падняць яго і – калі б хто іншы расказаў, не паверыў бы – вялізны, пры ўсім парадзе, прыгажун баравік. Гукаю сваіх. А яны, аказваецца, ужо па некалькі белых грыбоў маюць. Пачынаецца саперніцтва – хто больш!

Раз на раз, вядома, не даводзіцца. Прыходзілі дамоў і з пустымі кошыкамі... Але перапоўненыя ўражаннямі ад лесу і яго насельнікаў. Ці ж не будзеш помніць, калі ў якім метры ад цябе выскачыў – і даў такога дзёру! – заяц-шарак, калі даверлівая вавёрка ледзь не з рук брала пачастунак, калі птушка, ратуючыся ад пагоні, забівалася аж у самае крысо пінжака.

А колькі людзей – сапраўдных аматараў прыроды, якія не тое што дрэўца зламаць, галінку закрануць не адважацца, – давялося сустрэць. Вось Міхась Фёдаравіч Караткевіч (на вялікі жаль, цяпер ужо – нябожчык). У свой час быў памочнікам ляснічага ў Белавежскай пушчы. Пачне расказваць – заслухаешся: «У прыродзе трэба мець вялікія вушы, вострыя вочы. Тады такога наслухаешся, такое ўбачыш!.. Нават ноччу. Ціха, здаецца, а прырода жыве, дыхае. Якое ў мяне здароўе – вайну прайшоў... Пушча лячыла, гаіла, моцы надавала. І цяпер во "скруціць" – не прадыхнуць, а ты ў лес на гадзіну, паўгадзіны – і адразу палепшае, боль знімае. Лес – маё выратаванне».

Дык чаму тады ветэрана-лесавода, усіх нас хвалюе лёс «зялёнага сябра»? Чаму пад пілу і сякеру трапляюць цэлыя кварталы лесу? Чаму ён усё далей адступае ад горада? Тысяча – чаму? Не на ўсё знойдзеш адказ.

Але што часам дапамагаем нішчыць прыроду – факт... Вось размясцілася адна з кампаній. Гучыць музыка, чуваць смех – інтэлігентныя маладыя людзі. Сапраўдны ж твар «інтэлігентаў» праяўляецца тады, калі пачынаюць нарыхтоўваць жэрдкі для палаткі, дровы для кастра – аж стогне, плача лес...

Добра «прыкладаюць» руку і ўладальнікі шматлікіх дач, некаторыя тутэйшыя жыхары. Логіка ў іх «жалезная»: вырастуць дрэвы яшчэ. Можам і не дачакацца... Бо з сеянцаў, саджанцаў рукатворны бор вырастае мінімум праз 70 гадоў. Не можа не трывожыць той факт, што ў радыусе трохчатырох кіламетраў не знайсці ніводнай маладой елкі. А ці ж не даводзіцца часам сутыкацца з такімі «аматарамі» прыроды, якія з'яўляюцца ў лес са спецыяльнымі прыстасаваннямі і так пакруцяць, здратуюць чарнічнік, што адразу і не разбярэш, хто тут быў – звер ці чалавек.

Балюча, але яшчэ, як кажуць, цярпіма ў параўнанні з тым, якую шкоду прыносяць лясныя пажары. Сыдзіце на канечным прыпынку «адзінкі», прасуньцеся ў глыбіню лесу на паўтарыдзве сотні метраў і ўбачыце такое!.. Можна ўявіць, як разгортваліся падзеі. Некі бестурботны чалавек распаліў касцёр. Грэўся, рыхтаваў снедзь ці яшчэ што-небудзь і, не затушыўшы агонь, пайшоў... У касцёр трапілі сухія лісты, зашмальцаваная папера, І ён разгарэўся. Агонь па сухой траве перакінуўся на кусты, вышэй... Клакацістае полымя скакала па дрэвах, выкідвала жоўтыя языкі. Злавеснымі слупамі круціўся шызы дым. У муках і сутаргах гінулі дрэвы, плакалі смалістымі слязамі.

Вось ён, вынік чалавечай бяспечнасці – мёртвы лес. Чорна. Пуста, нават грыбы растуць колеру полымя, іх ніхто не бярэ. Заляціць птушка ды імкнецца хутчэй выбрацца назад. Чалавек, каб не псаваць настрой, абыходзіць гэта месца.

І яшчэ аб адным нельга не сказаць – забруджванні лесу. У апошні час гэта з'ява набыла пагражальныя памеры. Вязуць з прадпрыемстваў, з гарадскіх прыватных кватэр. Хто – што: жалезабетонныя блокі, калючы дрот, адходы гумовай, швейнай прамысловасці, прадметы хатняга ўжытку. Ледзь з'ехаў з дарогі – і скідае... Горы лому, кучы смецця. Нямала часу пройдзе, пакуль прырода схавае сляды чалавечай безгаспадарчасці.

Дакуль такое будзе працягвацца? Дзе тыя службы, якія стаяць на варце прыроды, лясной гаспадаркі? Ды што казаць, адным прыродаахоўным органам цяжка справіцца з навядзеннем парадку ў прыгараднай і больш аддаленай лясной зоне. Трэба ўсім нам праяўляць зацікаўленасць і гаспадарчы падыход, таму што гэта – у нашых з вамі інтарэсах.

Лес і поле. Яны – дзеці адной маці-прыроды, аднаго цэласнага арганізма. Яны – гэта мы з вамі, наша жыццё, існаванне. А значыць, і клапаціцца пра іх мы павінны як пра сябе самога – берагчы, ахоўваць, умела выкарыстоўваць!

Я АДШУКАЎ СВОЙ ТАЛІСМАН

Мікола МІНЧАНКА (Мікалай Нікіфаравіч Мінчанка) нарадзіўся 10 сакавіка 1942 года ў вёсцы Кавалёўка Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Пасля заканчэння Мілаславіцкай сярэдняй школы працаваў загадчыкам Кавалёўскага сельскага клуба. Затым быў прызваны ў рады Савецкай арміі. Пасля службы вучыўся на філалагічным факультэце Жытомірскага педагагчнага інстытута. З 1969 года працаваў у рэдакцыі Клімавіцкай раённай газеты на розных пасадах, у тым ліку і на пасадзе галоўнага рэдактара.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аўтар зборнікаў паэзіі "Зялёны звон" (1971 г.), "Давер" (1980 г.), "Ліпацвет" (1993 г.), "Маладзік над Клімавічамі" (1996 г.), "Шанс на адкрыццё" (1996 г.).

Вершы паэта змяшчаліся на старонках часопісаў "Маладосць", "Полымя", "Беларусь", "Бярозка", "Вясёлка", "Вожык", штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", газетах "Звязда", "Беларуская ніва", "Народная газета", "Магілёўская праўда", "Магілёўскія ведамасці", раённых выданнях, перыядычнага друку і некаторых альманахах "Дзень паэзіі", абласных альманахах. Піша на беларускай і рускай мовах.

Мікалай Нікіфаравіч зараз на заслужаным адпачынку, але працягвае плённа працаваць, перадае свой вялікі прафесійны і жыццёвы вопыт маладому пакаленню. Праводзіць шмат творчых сустрэч з моладдзю.

За плённую літаратурную дзейнасць удастоены звання "Лаўрэат прэміі камсамола Магілёўшчыны", лаўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Пісьмянкова Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ЧАРОЎНАЯ КРЫНІЦА

Шэпча лес і шэпчуць нівы,
Восень сцеле свой дыван.
Я вясёлы і шчаслівы –
Адшукаў свой талісман.

І іду бадзёры, смелы
Праз балоты і лясок.
Не каменьчык гэта белы
І не жоўты паясок.

Адшукаў крыніцу тую,
Дзе зімою п'юць ласі.
І яе, нібы святую,
Век ахоўваюць лясы.

Я са сцежачкі ня збіўся.
Вось крыніца з той вадой.
Калі ж ты з яе запіўся –
Не сустрэнешся з бядой.

Бо дае крыніца сілы
Выстаяць у грозны час.
Край мой родны, край мой мілы.
Ты адзін навек для нас.

ІСЦІНА

Пры пошуку ісціны часта бывае:
Ісціна міма, як сон, праплывае.
І адлятае далёка, далёка
І лётае потым зусім адзінока.
Шукальнікі ісціны мараць пра цуды,
Нібы не было пацалуначка юды,
Што выдаў Хрыста на злое распяцце.
За срэбра – ліхое багацце.
А ісціна часта ў нашым сумленні –
Перад няпраўдай не стаць на калені,
Не стаць той няпраўдзе ісцінай голай.
Даць акрыяць ісціне кволай.
Каб, як і вера Хрыстова, мацнела.
За шчырасць і шчодрасць змагалася смела.
Розныя ісціны на белым свеце,
Галоўнае – усе мы Ісусавы дзеці.
Жыццё ўсё ў змаганні за дзень, што як свята.
Каб не пакрыўдзіць сястру або брата.

Літаратурная старонка газеты «Магілёўскія ведамасці» і абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Падрыхтавалі Алесь КАЗЕКА і Святлана КАЗЕКА.